Политизация общества, т. е. увеличение веса политики как фактора, влияющего на все стороны материальной и духовной жизни, стала примечательным явлением нашего времени. Политизация современного белорусского общества – результат перестройки властно-управленческой машины. В структуру этой машины вошли и СМИ – они-то как раз и стали и первопричиной, и средством этой политизации. Основную роль, безусловно, сыграло отсутствие у молодого белорусского общества, а значит, и у молодой белорусской журналистики, качественной политической культуры. Ведь она, культура, вовсе не «интегральная характеристика». Политкультура для журналиста – не результат его действий, а сами эти действия. Отбросить идейность, партийность, политизированность даже в мелочах – значит, иметь высокую культуру. Не говорить о политике, когда можно обойтись без нее, – в этом практическое значение и смысл политической культуры журналиста.

**Литература**


1. *Тард Г.* Мнение и толпа // Психология толп. М., 1998 г.
2. *Кара-Мурза С. М.* Манипуляция сознанием. М.: Алгоритм, 2000 г.
3. *Корконосенко С. Г.* Журналистика в мире политики. СПб.: Изд-во Михайлова, 2004 г.


## БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ Ў СУЧАСНАЙ ЭФІРНАЙ ПРАСТОРЫ

**Н. Я. Скараход**

Сёння Беларускае радыё – гэта адзін з самых папулярных дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі; высокатэхналагічная структура, якая ўключае ў сябе 2 агульнанацыянальныя каналы і 3 радыёстанцыі.

Сучасныя тэхнічныя стандарты дазволілі па-новаму сфармуляваць вяшчальную палітыку. У яе аснове – масавасць, даступнасць, вялікі аб'ём інфармацыі, аператыўнасць, актуальнасць. Новыя тэхнічныя магчымасці забяспечваюць устойлівы прыём праграм не толькі на ўсёй тэрыторыі Беларусі, але і на памежных раёнах Польшчы, Літвы і Латвіі, перадачы рэтранслiруюцца на рэгіёны Расіі, Украіны.

У аснове вяшчання Беларускага радыё ў сезоне 2004–2005 гадоў закладзены прынцып вытворчасці высокаякаснага радыёпрадукта, які задавальняў патрабаванні насельніцтва краіны, адпавядаў духу часу і беларускаму менталітэту.

Асноўныя задачы Беларускага радыё:

1. адлюстраванне дзяржаўнай унутранай і знешняй палітыкі шляхам аб'ектыўнага і аператыўнага інфармавання слухачоў аб асноўных

падзеях у палітычным, эканамічным, грамадскім, культурным і спартыўным жыцці краіны;

2. вытворчасць асабістага інфармацыйнага, аналітычнага, публіцыстычнага, мастацкага і музычна-забаўляльнага прадукта, забеспячэнне яго высокай якасці;

3. асваенне інфармацыйнай прасторы РБ і замежных краін.

Асноўны прынцып вяшчальнай палітыкі, закладзены ў сетцы вяшчання, структуры праграм, іх напаўненні і гучанні прызваны стварыць імідж саліднага, аўтарытэтнага і высокапрафесійнага сродка масавай інфармацыі. Характар вяшчання – злучэнне інфармацыйных, грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурна-асветніцкіх і забаўляльных праграм для мэтавых аўдыторый.

Адзін з галоўных накірункаў вяшчальнай палітыкі Беларускага радыё – папулярызацыя нацыянальнай і сусветнай культуры. Гэту задачу сёння паспяхова выконвае канал «Культура». Сёння ён прадстаўляе класічныя радыёпастаноўкі, дыскусіі, інтэрактыўнае шоу, класіку, віншавальныя праграмы і інтэлектуальныя віктарыны. Вяшчальная палітыка канала скіравана на тых, хто любіць музыку і літаратуру, цікавіцца гісторыяй і сённяшнімі культурнымі падзеямі.

З мая 1962 года Беларускае радыё вядзе  рэгулярнае вяшчанне на краіны далёкага замежжа. Сёння праграмы радыёстанцыі «Беларусь» гучаць у эфіры 5 гадзін у суткі на чатырох мовах: беларускай, рускай, англійскай і нямецкай. З 3 студзеня 2005 года радыёстанцыя «Беларусь» вяшчае ў Інтэрнэце на англійскай мове.

Беларускае радыё пастаянна развіваецца. З 12 ліпеня 2003 года працуе радыёстанцыя «Радыус-FM», штодзённае вяшчанне якой складае 23 гадзіны (з 5.00 раніцы да 4.00). Карыстаецца папулярнасцю ў слухачоў радыёстанцыя «Сталіца», якая вяшчае ва УКВ-дыяпазоне на частаце 72,89 МГц 20 гадзін у суткі (з 6.00 да 2.00). Яно працуе па прынцыпе «Радыё Сталіца – наша радыё». Перад калектывам стаяла задача стварыць беларускамоўную радыёстанцыю, якая магла канкурыраваць з астатнімі, і ён змог гэта зрабіць. Радыё «Сталіца» вяшчае 20 гадзін у суткі (з 6.00 да 2.00). Творчая група дае абяцанне не страціць чысціні галасоў, светлых думак і шчырасці ў адносінах да слухачоў.

«Візітная картка» Беларускага радыё – Першы Нацыянальны канал. Шмат увагі ўдзяляецца інфармацыйным накірункам («Радыёфакт», «Постфактум», «Падзеі: факты і каментарыі», «Рэгіён», «Агляд газет», «Навіны» ў рэжыме рэальнага часу ў пачатку кожнай гадзіны). Аб'ём сярэднесутачнага вяшчання – каля 4,5 гадзін (= 30 %) – дазваляе поўна і з дакладнай перыядычнасцю паведамляць аб падзеях, якія маюць грамадскую значнасць і рэзананс. Пры гэтым канал у процівагу сенсацыйнаці ставіць дакладнасць.

Стратэгія развіцця інфармацыйнага вяшчання прадугледжвае асваенне інфармацыйнай прасторы рэспубліканскага і міжнароднага маштабу. Беларускае радыё сёння мае самую шырокую карэспандэнцкую сетку, што дазваляе аператыўна і ўсебакова адлюстроўваць падзеі ў Беларускіх рэгіёнах. Штодзённа ўласныя карэспандэнты Беларускага радыё рыхтуюць каля 50 матэрыялаў. І працуюць не толькі ва ўсіх абласцях краіны, але і ў Расіі, Польшчы, Украіны, краінах Балтыі.

У новым сезоне ў структуры інфармацыйнага вяшчання выдзяляецца эканамічная тэматыка – штодзённыя агляды аператыўнай эканамічнай інфармацыі «Партнёр» (8.00, 13.00) і штодзённая інфармацыйна-аналітычная праграма «Эканамічны курс». Аналітычныя праграмы «Тэма дня», «Тэма тыдня», «Дэмакратыя – улада народа», «Сельская раніца», «Дыялог», «Прамая лінія», «Дыялог», «Рэальны сектар», «Палітыка», «Дзяржаўны інтарэс», «Актуальны мікрафон», «Аграрнае пытанне», «Без бар’ераў», «Беларусь–Расія», «Адкрытая пляцоўка», «Вертыкаль» (аб’ём сярэднясутачнага вяшчання – каля 5,5 гадзін (= 35 %) – па прынцыпе ўсебаковага кампетэнтнага аналізу асноўных накірункаў дзяржаўнай палітыкі, рэалізацыі дзяржаўных праграм. Улічваецца рознапланавасць і тэматычная накіраванасць аналітычных праграм. Аналітычнае вяшчанне ў гэтым сезоне існуе разам з інфармацыйным, дапаўняючы ў структуры інфармацыйнага дня адзін аднаго. Аб’ём праграм забаўляльнага вяшчання «Вітаем, віншуем, жадаем...», «Беларускі хіт-парад», «Музычны партал» – 15 %). Спартыўнае вяшчанне складае прыкладна 5 %. Найбольш папулярныя культурна-асветніцкія праграмы Першага Нацыянальнага – «Акадэмія навук», «Зямля, што дадзена нам лёсам», «Радыёваяж», «Здароўе», «Прававы канал», «Сацыяльны стандарт», «Мая краіна – Беларусь», «Ветэраны» (20 %).

Да свята 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне створаны цікавыя праекты на гэту тэму. Напрыклад, «Мінск – Масква: Аднапалчане» – цыкл сумесных радыёмастоў Першага Нацыяльнага канала і радыёстанцыі «Расія» (аўтары праекта – журналісты Валянціна Стэльмах і Ігар Зорын). Таксама існуе мост «Мінск–Кіеў».

Праект «Эпізоды Вялікай вайны», «Яны вызвалялі Беларусь», «Ветэраны», пастаянная рубрыка ў «Радыёфакце» – «Гаворыць гісторыя...» і «Гарады-героі насустрач Вялікай Перамозе» – усе яны прысвечаны важнай тэме, якая не страціла сваёй актуальнасці і пасля значнай даты 9 Мая.

Так працуе Беларускае радыё сёння. Імкнецца да таго, каб адлюстраваць усе сферы жыццядзейнасці грамадства, аператыўна інфармаваць слухачоў аб асноўных падзеях палітычнага, эканамічнага, грамадскага, культурнага і спартыўнага жыцця краіны.